Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці
Кафедра педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедрай

_______________ М.У. Камоцкі
___ ________________ 2021

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта

_______________ Н.Я. Шалупенка
___ ________________ 2021

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# **УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ**

*для спецыяльнасці1 – 23 01 14 – сацыяльна-культурная дзейнасць*

СКЛАДАЛЬНІК:
Байко Анжаліка Пятроўна, старшы выкладчк кафедры педагогікі
сацыяльна-культурнай дзейнасці

Разгледжаны і зацверджаны
на паседжанні Савета універсітэта 21.12.2021 г.
пратакол № 5

СКЛАДАЛЬНІК:

А. П. Байко, старшы выкладчк кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі „Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Рэцэнзенты:

Л. А. Пшаніцына, дацэнт кафедры агульнай і дашкольнай педагогікі установы адукацыі „Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка”, кандыдат педагагічных навук

Ю. У. Міцкевіч, дацэнт кафедры межкультурных камунікацый і рэкламыўстановы адукацыі „Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:
Кафедрай педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці
(пратакол ад 12.11.2021 г. № 5)

Саветам факультэта культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці
(пратакол ад 30.11.2021 г. №4)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ........................................................ 4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ........................................................ 6
2.1 ЛІТАРАТУРА ........................................................ 6
2.2 КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ ........................................................ 9
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ........................................................ 37
3.1. Тэматыка і методыка выканання практычных работ ........................ 37
4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ ........................................................ 53
4.1. Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў ........................................................ 53
4.2. Змест і формы прадстаўлення самастойнай работы студэнтаў .. 53
4.3. Крытэрыі ацэнкі партфоліа ........................................................ 55
4.4. Пералік пытанняў для самаправеркі ........................................................ 56
4.5. Тэсты для самаправеркі ведаў па выніках вывучэння вучэбнай дысцыпліны ........................................................ 56
4.6. Пытанні і заданні да заліку ........................................................ 61
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ........................................................ 64
5.1. Вучэбная праграма ........................................................ 64

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна ―Уводзіны ў спецыяльнасць” уключана ў абавязковы кампанент вучэбнага плана для студэнтаў спецыяльнасці 1-23 01 14 «сацыяльна-культурная дзейнасць».

Прафесійная арыентацыя студэнтаў, разуменне імі сутнасці прафесіі, усвядомленае, сур’ѐзнае стаўленне да прафесійнай падрыхтоўкі спрыяюць хутчэйшаму і, галоўнае, больш якаснаму фарміраванню спецыяліста ў сучасных умовах. Гэта і вызначае важнасць вучэбнай дысцыпліны ―Уводзіны ў спецыяльнасць”, якая прафесійна арыентуе студэнтаў, дазваляе атрымаць досыць поўнае ўяўленне аб сваѐй спецыяльнасці і будучай прафесіі, хутчэй адаптавацца да новых умоў вучобы ва ўніверсітэце. Студэнты атрымліваюць першапачатковыя веды аб сутнасці, спецыфіцы прафесіі спецыяліста па сацыяльна-культурнай дзейнасці, інфармацыю аб досыць складанай сістэме яго падрыхтоўкі ў УВА.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны ―Уводзіны ў спецыяльнасць” – знаѐмства студэнтаў з першапачатковымі, агульнымі ведамі аб спецыяльнасці і будучай прафесіі, таксама з прыѐмамі пошуку і асэнсавання прафесійнай інфармацыі, элементамі навукова-даследчай дзейнасці, практыка-арыентаванымі спосабамі авалодання прафесіяй.

*Асноўныя задачы*, якія рэалізуюць дадзеную мэту:

– даць аб’ектыўнае ўяўленне аб сістэме навучання ва ўніверсітэце, кампанентах прафесійнай кампетэнтнасці і відах прафесійнай дзейнасці спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– пазнаѐміць з тэхналогіямі пошуку крыніц навуковай інфармацыі, атрымання ведаўі ўменняў, спецыяльных навыкаў падчас практыка-арыентаванага навучання і навукова-даследчай дзейнасці;

– фарміраваць асновы сучаснай арганізацыйнай культуры, ашчаднага выкарыстання часу самастойнай работы і самаадукацыі ў сферы культуры.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– напрамкі спецыяльнасцей і спецыялізацыі ў галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь;

– пералік і назначэнне асноўных устаноў сацыякультурнай сферы (дзяржаўнага, ведамаснага, прыватнага, грамадскага і камерцыйнага сектараў);

– асноўныя патрабаванні, кваліфікацыйную характарыстыку і кампетэнцыі спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– асаблівасці арганізацыі вучэбна-творчай і навукова-даследчай работы студэнта;

– свае правы, абавязкі, патрабаванні да арганізацыі культуры быту ў інтэрнатнай установе.

Студэнт павінен*умець:*

– арыентавацца ў сістэме ведаў прафесійнага асяроддзя;

– працаваць з навуковай, вучэбнай, даведачнай літаратурай,выкарыстоўваць сучасныя інфармацыйна-камунікацыйныятэхналогіі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– рацыянальна арганізоўваць вучэбны і вольны час;

– аргументаваць уласную думку;

– скласці партфоліа і весці дзённік назіранняў.

Студэнт павінен*валодаць:*

– катэгарыяльным апаратам у галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– метадамі работ са спецыяльнай літаратурай.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны ўключае 6 тэм. Па кожнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў дакладных кампетэнцый выкладчыкам праектуюцца і рэалізуюцца пэўныя педагагічныя тэхналогіі. Сярод найбольш перспектыўных і эфектыўных сучасных адукацыйных сістэм і тэхналогій, якія дазваляюць рэалізаваць сістэмна-дзейнасны кампетэнтнасны падыход у вучэбна-выхаваўчым працэсе, выдзяляюцца: варыятыўныя модулі самастойнай працы студэнтаў, інфармацыйныя тэхналогіі, методыкі інтэрактыўнага навучання.Засваенне зместу вучэбнай дысцыпліны мяркуе ўжыванне інтэрактыўных і праектных метадаў, практыка-арыентаванага навучання, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій на лекцыйных і практычных занятках.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны ―Уводзіны ў спецыяльнасць" усяго прадугледжана 90 гадзін, з іх 54 гадзіны– аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 24 гадзіны – лекцыі, 30 гадзін – практычныя заняткі.

Рэкамендаванай формай кантролю ведаў з'яўляецца залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

Лекцыйны матэрыял, прадстаўлены ў вучэбна-метадычным комплексе, складзены з лекцыйнага і вучэбна-метадычнага матэрыялу, прадстаўленага ў айчынных і замежных выданнях.

### 2.1 ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*


1. *Загинайлов, Ю.Н.* Основы информационной безопасности: курс визуальных лекций [Электронный ресурс]: учеб.пособие / Ю.Н. Загинайлов. – М. ;Берлин : Директ-Медиа, 2015. – 105 с.– Режим доступа:http://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=362895 – Дата доступа: 12.06.2019.
2. *Казанцева, В. В.* Функции и направления деятельности специалистов социально-культурной сферы [Электронный ресурс]/ В. В. Казанцева // Сиб. пед. журнал. – 2007. – № 7. – С. 168–174. – Режим доступа:http://cyberleninka.ru/article/n/ funktsii-i-napravleniya-deyatelnosti-spetsialistov-sotsialno-kulturnoy-sfery.– Дата доступа: 10.01.2021.
3. *Круглова, Т. Ю.* Сущностная характеристика понятия «социально-культурная деятельность» [Электронный ресурс]/ Т. Ю. Круглова // Вестн. ОГУ. – 2005. – № 4. – С.146–149.–Режим доступа:http://vestnik.osu.ru/2005_4_1/27.pdf.– Дата доступа: 01.11.2021
4. *Кузнецов, И. Н.* Основы научных исследований [Электронный ресурс]: учеб.пособие : [16+] / И.Н.Кузнецов. – 5-е изд., перераб. – М. : Дашков и К°, 2020. – 282 с. –Режимдоступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=573392. – Дата доступа: 01.11.2021
5. *Культурно-просветительская деятельность в учреждениях культуры XXI века*[Электронный ресурс]: учеб.пособие / А. В. Каменец, А. И. Щербакова, Н. И. Ануфриева [и др.]. – Москва : РГСУ, 2020. – 112 с. – Режим доступа: https://e.lanbook.com/book/158513.– Дата доступа: 01.10.2021.
6. *О Концепции информационной безопасности Республики Беларусь* [Электронный ресурс]: постановление Совета безопасности Республики Беларусь 18 марта 2019 г. № 1 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь.– Режим доступа: http://pravo.by/upload/docs/op/P219s0001_1553029200.pdf. – Дата доступа: 01.10.2021
7. *Рогачѐва, О.В.* История социально-культурной деятельности : учебное пособие / Рогачѐва О.В. – Минск : Вышэйшая школа, 2019. – 128 с.
8. *Романенко, Л. Е.*Социокультурная деятельность (прикладная культурология) : пособие для работников культуры / Л. Е. Романенко. – Минск : Издатель Владимир Сивчиков, 2019. – 139 с.
9. *Социально-культурная деятельность учреждений культуры*[Электронный ресурс]: учеб.-метод. пособие / сост. Е. В.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Харьковская [и др.]. – Белгород : БГИИК, 2019. – 162 с. – Режим доступа: https://e.lanbook.com/book/153876. – Дата доступа: 01.10.2021.

10. *Фалеева, Л. В.* Организация процесса формирования культуры самоорганизации студентов бакалавриата[Электронный ресурс] / Л. В. Фалеева // Совр. проблемы науки и образования. – 2013. – № 1. – С. 201. – Режим доступа:http://cyberleninka.ru/ article/n/organizatsiya-protsessa-formirovaniya-kultury-samoorganizatsii-studentov-bakalavriata.– Дата доступа: 01.10.2021

*Дадатковая*

1. *Беларусы.* Т. 6. Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [іінш.]; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі ; рэдкал.: В.М.Бялявіна, М.Ф.Піліпенка, І.У.Чаквін. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 605, [1] с. : іл.

2. *Болотова,М.И.* Организация семейного досуга в образовательной среде учреждения дополнительного образования детей / М.И.Болотова. – М. : Компания Спутник +, 2005. – 52 с.

3. *Воронцов, Г. А.*Труд студента: ступени успеха на пути к диплому : учебное пособие для студентов высших учебных заведений / Г. А. Воронцов. – 2-е изд., перераб. и доп. – Москва : ИНФРА-М, 2019. – 255, [1] с.

4. *Гендина, Н. И.* Информационное образование и информационная культура как фактор безопасности личности в глобальном информационном обществе: возможности образовательных организаций и библиотек : монография / Н. И. Гендина. – Москва : Литера, 2016. – 391 с.

5. *Ершова, О. В.* Теория и методика пластико-хореографической подготовки будущих специалистов социально-культурной деятельности в вузе культуры и искусств : монография / О. В. Ершова. – Санкт-Петербург ; Москва ; Краснодар : Лань : Планета музыки, 2021. – 233, [2] с.

6. *Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры /*адк. за вып. Н.В.Судзілоўская. – Мінск : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп.Беларусь, 2016. – 271 с.

7. *Макарава,А.А.* Клубныя ўстановы як суб’ект рэалізацыі прыярытэтаў дзяржаўнай культурнай палітыкі / А.А.Макарава// Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры. – 2003. – № 2. – С.89–95.

8. *Макаров, А. В.*Реализациякомпетентностного подхода в системах высшего образования: отечественный и зарубежный опыт : учебно-методическое пособие / А. В. Макаров, Ю. С. Перфильев, В. Т. Федин. – Минск : РИВШ, 2015. – 207 с.

9. *Мойсейчук,С.Б.* Художественно-творческая деятельность детей-инвалидов: (вопросы социально-психологической реабилитации) / С.Б.Мойсейчук. – Минск : Веды, 2001. – 110 с.

10. *Наш цэнтр. Наша гісторыя. Наша будучыня* : да 80-годдзя стварэння абласных цэнтраў народнай творчасці / Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур ; [склад.: Т. М. Яскевіч, Р. І. Вайцяхоўская ; рэдкал.: В. В. Антоненка (старш.) і інш.]. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2019. – 307 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. *Паўлава, С. А.* Уводзіны ў спецыяльнасць : метад. дапам. / С.А.Паўлава / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : [б. в.], 2009. – 54, [ 1] с.

12. *Петренко, Е. С.* Современные инструменты тайм-менеджмента=Moderntime-managementtools : учебное пособие : [16+] / Е.С. Петренко, Л.В. Шабалтина, А.В. Варламов. – Москва : Креативная экономика, 2019. – 86 с. : ил. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=599621. – Дата доступа: 29.06.2021.

13. *Почебут, Л. Г.*Социальнаяпсихология : [учебник для вузов] / Л. Г. Почебут. – Санкт-Петербург [и др.] : Питер, 2017. – 399 с.

14. *Розанова, Н. М.* Научно-исследовательская работа студента : учебно-практическое пособие / Н. М. Розанова. – Москва :Кнорус, 2016. – 254, [1] с.

15. *Смаргович, И. Л.* Основы культурно-досуговой деятельности : учебно-методическое пособие для студентов вузов по направлению специальности 1-21 04 01-02 Культурология (прикладная) / И. Л. Смаргович ; [среди рец. Н. В. Самерсова]. – 2-е изд., стер. – Минск : БГУКИ, 2015. – 172, [1] с.

16. *Социокультурная деятельность как средство воспитания личности* : пособие для соц. педагогов и рук. учреждений образования / под общ. ред. В.Н.Наумчика. – Минск : Выш. шк., 2004. – 143 с.

17. *Суминова, Т. Н.*Арт-менеджмент: теория и практика : учебник для студентов высших учебных заведений сферы культуры и / Т. Н. Суминова. – Москва : Академический проект, 2020. – 655 с.

*18. Технология социально-культурной деятельности*: учеб.-метод.пособие для студентов учреждений высш. образования по специальности 1-23 01 14 Социально-культурная деятельность / Л. И. Козловская [и др.] ; Белорус. гос. ун-т культуры иискусств. – Минск : БГУКИ, 2014. – 205 с.

19. *Ярошенко, Н.Н.* Социально-культурная деятельность: парадигмы, методология, теория / Н.Н.Ярошенко ; Моск. гос. ун-ткультурыи искусств. – М. : МГУКИ, 2000. – 204 с.

*Электронныя рэсурсы*

1. *www.kultura.by/ М-ва культуры*Рэсп.*Беларусь*
2. http://repository.buk.by:8080/jspui/ Рэпазіторый БДУКМ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.2 КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ

### *Тэма 1. Уводзіны. Мэта, задачы вучэбнай дысцыпліны. Прафесія «Спецыяліст па сацыяльна-культурнай дзейнасці, выкладчык»*

1.1 Мэта і задачы курса ―Уводзіны ў спецыяльнасць”.

1.2 Агульныя звесткі аб кірунках падрыхтоўкі па спецыяльнасці ―сацыяльна-культурная дзейнасць”.

1.3 Перспектывы працаўладкавання выпускнікоў

*1.1 Мэта і задачы курса “Уводзіны ў спецыяльнасць”*

Сацыяльна-культурная дзейнасць уяўляе сабой грамадсказначны феномен, падсістэму духоўнага жыцця грамадства, якая ў сваю чаргу падзяляецца на педагагічную, сацыяльную і навучальную падсістэмы. Сацыяльна-культурная дзейнасць звязана з уключэннем асобы ў грамадскія адносіны праз вядучыя інстытуты сацыяльна-культурнай сферы. Сацыяльныя інстытуты фарміруюць спрыяльнае культурнае асяроддзе, неабходнае для ажыццяўлення разнастайных відаў культурнай дзейнасці.

У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры (Артыкул 79. Напрамкі культурнай дзейнасці)вызначана, што…

―Культурная дзейнасць ажыццяўляецца па наступных напрамках:

- творчая дзейнасць;
- ахова гісторыка-культурнай спадчыны;
- ахова археалагічнай спадчыны;
- бібліятэчная справа;
- музейная справа;
- народныя мастацкія рамѐствы;
- кінематаграфічная дзейнасць;
- арганізацыя і правядзенне культурных мерапрыемстваў;
- дзейнасць прафесійных калектываў мастацкай творчасці;
- дзейнасць непрафесійных (аматарскіх) і аўтэнтычных фальклорных калектываў мастацкай творчасці;
- арганізацыя культурнага адпачынку (вольнага часу) насельніцтва”.

Сацыяльна-культурная дзейнасць як сацыяльная сістэма функцыянальна аб'ядноўвае розныя сацыяльныя інстытуты, якія закліканы забяспечыць распаўсюджванне духоўна-культурных каштоўнасцей, іх актыўнае творчае засваенне кожнай асобай.Патрэбы грамадскага развіцця ў функцыянаванні сацыяльна-культурнай дзейнасці могуць быць выяўленыпраз чаканні і патрабаванні грамадства да гэтага віду дзейнасці, якая спрыяе культурнаму развіццю і ўмацаванню грамадскіх адносін. Патрэба ў ажыццяўленні працэсу сацыялізацыі асобы праз сацыякультурныя інстытуты з'яўляецца адной з вядучых.

Сацыякультурныя інстытуты выхавання, адукацыі і вольнага часу ўяўляюць сабой своеасаблівыя сховішчы неспецыфічных ведаў і механізмы іх трансляцыі з пакалення ў пакаленне. На сацыяльным узроўні найбольш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паказальным інстытутам з'яўляецца клуб, цэнтры вольнага часу і іншыя ўстановы культурна-адпачынкавага тыпу. Сацыяльна-культурныя і культурна-забаўляльныя формы дзейнасці гэтых установаў даюць агульнае ўяўленне аб развіцці культуры ў краіне і рэгіѐне, аб культурных каштоўнасцях, нормах сацыяльнага жыцця, способах і стылях існавання і г.д. Таму ў працэсе дзейнасці, якая арганізоўваецца гэтымі ўстановамі, набываюцца разнастайныя уяўленняў, якія служаць пэўнымі арыенцірамі ў культуры і сацыяльным жыцці.

У культурна-адпачынкавых установах набываюцца таксама пэўныя навыкі паводзін і зносін людзей адзін з адным у афіцыйных і нефармальных сітуацыях, уяўленні аб культурных ідэнтычнасцях; засвойваюцца ўяўленні аб сацыякультурных статусах, ролях, нормах і санкцыях; набываюцца практычныя веды і навыкі, неабходныя для адэкватнага існавання ў непасрэдным жыццѐвым асяроддзі. Гэтыя навыкі з'яўляюцца сацыяльна значным дадаткам да вопыту, які набываецца ў сям'і, школеі іншыхсацыяльных установах. Такім чынам, сацыяльна-культурная дзейнасць па сутнасці можа разглядацца як самастойная падсістэма агульнай сістэмы сацыялізацыі асобы, сацыяльнага выхавання і адукацыі людзей.

Патрэба кіравання дзейнасцю людзей у мэтах іх развіцця і рацыянальнага выкарыстання вольнага часу таксама абумовіла стварэнне і развіццѐ сістэмы сацыяльна-культурных установаў. Усякае грамадства, як самарэгулявальная сістэма, імкнецца накіроўваць дзейнасць людзей, пры гэтым дамагаецца ўзгодненасці іх дзеянняў. У грамадстве дзейнічаюць розныя віды рэгулявання, якія адпавядаюць пэўнаму перыядуразвіцця і патрэбам дадзенага грамадства. Сацыяльна-культурная дзейнасць з'яўляецца адным з відаў сацыяльнага кіравання. Ва ўмовах вольнага часу сацыяльнае кіраванне ажыццяўляецца пераважна сродкамі ненарматыўнага рэгулявання дзейнасці людзей, шляхам арганізацыі формаў і сродкаў задавальнення культурных патрэб, фарміравання і актуалізацыі грамадскайдумкі. Такім чынам, патрэба грамадства ў рэгуляванні дзейнасці людзей ва ўмовах вольнага часу мае наступныя ўзаемазвязаныя мэты: па-першае, забяспечыць развіццѐ духоўных творчых сіл чалавека; па-другое, рацыянальна арганізаваць вольны час, стварыць умовы для станоўчай дзейнасці асобы, нейтралізуючы адмоўныя способы баўлення часу.

Грамадству далѐка не абыякава, які выбар зробіць індывід, як ѐн будзе распараджацца сваім вольным часам. Да вольнага часу прад'яўляюцца патрабаванні не толькі аднаўлення фізічных і псіхічных сіл чалавека, але таксама іх далейшага ўзбагачэння і развіцця.Як следства, мэтанакіраваная арганізацыя сферы вольнага часу становіцца найважнейшай задачай дзяржаўнагаўзроўню.

Сацыяльна-культурная дзейнасць мае свае, уласцівыя ѐй характэрныя рысы:

а) ажыццяўляецца ў вольным часе, характарызуецца свабодай выбару, добраахвотнасцю, ініцыятыўнасцю ўдзельнікаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

б) абумоўлена нацыянальнымі і рэгіянальнымі асаблівасцяміі традыцыямі;

в) характарызуецца разнастайнасцю відаў заснаванымі на разнастайнасці інтарэсаў (мастацкія, пазнавальныя, сацыяльныя, палітычныя, сямейныя, бытавыя, прафесійныя і інш.);

г) рэалізуецца ў інстытуцыйных і неінстытуцыйных формах;

в) адрозніваецца глыбокай асобаснай скіраванасцю, паколькі нясе ў сабе рысы індывідуальнасці, рэалізуецца ў адказ на патрэбы і інтарэсы асобы;

е) ажыццяўляецца праз сістэму масавых, групавых і індывідуальных формаў дзейнасці;

ж) ѐй уласціва мэтанакіраванасць і мэтазгоднасць (менавіта свядома пастаўленая мэта прыводзіць у рух дзейнасць: папярэдняя прадуманасць дзеянняў пасля яе пастаноўкі, аналіз сітуацыі, у якой чалавеку трэба будзе дзейнічаць, выбар спосабаў і сродкаў дасягнення мэты вызначаюць паслядоўнасць дзеянняў асобы ў сацыяльна-культурнай сферы);

з) носіць гуманістычны і развіваючы характар;

і) арыентавана на сацыяльную дапамогу, сацыяльную абарону і сацыяльна-псіхалагічную рэабілітацыю розных сацыяльна-дэмаграфічных груп.

Таму ў сучасным грамадстве тэрмін ―сацыяльна-культурная дзейнасць" у звычайным жыцці ўжываецца ў трох азначэннях: як грамадская практыка, як вучэбны прадмет, як гістарычна склаўшаяся галіна навуковых ведаў – тэорыя, якая развіваецца дзякуючы намаганням шматлікіх вучоных і практыкаў. Гэта важна, таму што навуковы статус і грамадскае прызнанне той ці іншай навукі залежаць ад ступені распрацаванасці яе тэарэтычных асноў. А дляграмадскага прызнання прафесійнай дзейнасці неабходна прафесійная падрыхтоўка спецыяліста, які валодае ведамі, уменнямі і навыкамі арганізацыі розных відаў і формаў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Дысцыпліна ―Уводзіны ў спецыяльнасць" ставіць сваѐй мэтай – стварэнне аб'ектыўных умоў для разумення студэнтамі першага курса кампанентаў прафесійнай кампетэнтнасці для паспяховай працы на пасадах, якія адпавядаюць спецыяльнасці; усведамлення сваіх жыццѐвых мэт, месца ў новай эканамічнай і сацыяльнай рэальнасці.

Асноўныя задачы, якія рэалізуюць дадзеную мэту:

– даць аб’ектыўнае ўяўленне аб кампанентах прафесійнай кампетэнтнасці і відах прафесійнай дзейнасці спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– пазнаѐміць з тэхналогіямі атрымання ведаў, уменняў і спецыяльных навыкаў ва ўніверсітэце;

– фарміраваць асновы сучаснай арганізацыйнай культуры, ашчаднага выкарыстання часу для самастойнай работы, самаадукацыі ў сферы культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *1.2 Агульныя звесткі аб кірунках падрыхтоўкі па спецыяльнасці“сацыяльна-культурная дзейнасць”*

Згодна з адукацыйным стандартам, які ўстанаўлівае мэты і задачы прафесійнай дзейнасці спецыяліста, патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі выпускніка вну, патрабаванні да зместу адукацыйнай праграмы і яе рэалізацыі, патрабаванні да забеспячэння адукацыйнага працэсу і выніковай дзяржаўнай атэстацыі выпускніка, – падрыхтоўка выпускніка па спецыяльнасці “Сацыяльна-культурная дзейнасць” забяспечвае атрыманне прафесійнай кваліфікацыі “Спецыяліст па сацыяльна-культурнай дзейнасці. Выкладчык”. У адпаведнасці з ОКРБ 011-2001спецыяльнасць “Сацыяльна-культурная дзейнасць” адносіцца да профілю падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй “Камунікацыі. Права. Эканоміка. Кіраванне. Эканоміка і арганізацыя вытворчасці” і мае абазначэнне 23 01 14.

Агульныя мэты падрыхтоўкі спецыяліста:

– фарміраванне і развіццѐ сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці, якая дазваляе спалучаць акадэмічныя, прафесійныя, сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі для рашэння задач у сферы прафесійнай сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– фарміраванне прафесійных кампетэнцый для работы ў галінах культуры, мастацтва, адпачынку, адукацыі.

Навучанне па спецыяльнасці прадугледжвае наступныя формы: вочная (дзѐнная) – 4 гады, завочная – 5 гадоў.

Пасля атрымання дыплома спецыялісты сацыяльна-культурнай дзейнасці атрымоўваюць магчымасць працягнуць адукацыю ў магістратуры і аспірантуры.

### *1.3 Перспектывы працаўладкавання выпускнікоў*

Аб’ектаміпрафесійнайдзейнасціспецыялістаў па сацыяльна-культурнай дзейнасці з’яўляюцца каштоўнасці культуры, інтарэсы і патрэбнасці насельніцтва ў розных відах адпачынку, сацыяльна-культурныя праграмы і праекты па арганізацыі вольнага часу ва ўстановах культуры і мастацтва, турысцка-экскурсійных прадпрыемствах, санаторна-курортных, навукова-даследчых і навучальных установах, грамадскіх арганізацыях і аб’яднаннях.

З улікам спецыялізацый “арганізацыя і методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці ва ўстановах культуры і адпачынку”, “арганізацыя і методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці ў санаторна-аздараўленчых і турысцка-спартыўных установах” размеркаванне і працаўладкаванне выпускнікоў адбываецца ва ўстановы культуры,сацыякультурныяцэнтры, на прадпрыемствы іў дзяржаўныя органы,сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы, фірмы і кампаніі, навукова-даследчыя інстытуты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Тэма 2. Спецыяльнасць “сацыяльна-культурная дзейнасць” у кантэксце сусветнай і айчыннай вучэбна-навуковай практыкі***

2.1 Гісторыя і арганізацыйная структура ўніверсітэта, перспектывы яго развіцця.

2.2 Нарматыўна-прававое і вучэбна-праграмнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу спецыяльнасці “сацыяльна-культурная дзейнасць”у вышэйшай школе.

2.3 Спецыфіка прафесійнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці “сацыяльна-культурная дзейнасць” ва ўніверсітэце.

2.4 Фарміраванне ў Рэспубліцы Беларусь інфармацыйнага грамадства і значэнне Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі

***2.1 Гісторыя і арганізацыйная структура ўніверсітэта, перспектывы яго развіцця***

Інфармацыя з афіцыйнага сайта БДУКМ http://www.buk.by/about/

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў створаны на базе Мінскага інстытута культуры, які пачаў дзейнічаць з 1975 г. у адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў БССР ад 04.05.1975 г. №139 і загадам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР ад 14.05.1975 № 234.Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 662 Мінскі інстытут культуры быў пераўтвораны ў Беларускіўніверсітэт культуры. Адбылася маштабная рэарганізацыя факультэтаў і кафедраў, у выніку чаго пачалася падрыхтоўка спецыялістаў па новых спецыяльнасцях і спецыялізацыях.Актывізаваліся міжнародныя сувязі, адкрыліся магістратура і Мазырскі філіял факультэта завочнага навучання. У 1996 г. паспяхова прайшлі атэстацыя і акрэдытацыя універсітэта, а 26.11.1999г. загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 703 універсітэту нададзены статус вядучай вышэйшай навучальнай установы ў нацыянальнай сістэме адукацыі ў сферы культуры.Загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 08.10.2004 г. №166 Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры” была перайменавана ва Установу адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.

Універсітэт размяшчаецца ў чатырох вучэбных карпусах – I корпус (вул. Рабкораўская, 17), II корпус (вул. Маскоўская, 18а), III корпус (вул. Маскоўская, 18а) і будынак інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, маюцца тры інтэрнаты: інтэрнат №1 (вул. Рабкораўская, 15), інтэрнат № 2 (вул. Рабкораўская, 13) і інтэрнат інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

Асноўныя спецыяльнасці, па якіх вядзецца падрыхтоўка ў БДУ культуры і мастацтваў – “Культуралогія”, “Рэжысура свят”, “Сацыяльна-культурная дзейнасць” “Народная творчасць”, “Харэграфія”, “Мастацтва эстрады”, “Бібліятэказнаўства і бібліяграфія”, “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны”, “Мастацтвазнаўства”, “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”. Ва ўніверсітэце, акрамя чатырохгадовага тэрміну

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навучання, вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў у галіне культуры і мастацтва са скарочаным тэрмінам навучання на аснове дамоў з Магілёўскім дзяржаўным бібліятэчным каледжам імя А.С. Пушкіна,




**Малюнак – Структура ўніверсітэта з 01.09.2021 г. (крыніца http://buk.by)**

Гродзенскім дзяржаўным каледжам мастацтваў і Дзяржаўнай сярэдняй школай-каледжам мастацтваў (г. Бабруйск). Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў забяспечвае падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі праз магістратуру (спецыяльнасці: “Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці”, “Культуралогія”, “Мастацтвазнаўства”, “Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства”, “Музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб’ектаў”, “Арт-менеджмент”), аспірантуру (“Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства”, “Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці”, “Тэорыя і гісторыя мастацтваў”, “Тэорыя і гісторыя культуры”, “Музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб’ектаў”) і дактарантуру. Ва ўніверсітэце працуюць саветы па абароне кандыдацкіх і доктарскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дысертацый. Фактычна па ўсіх спецыяльнасцях створаны цыкл бесперапыннай падрыхтоўкі спецыялістаў — ад выпускніка школы, каледжа, праз ступені студэнцтва, магістратуры, аспірантуры, дактарантуры, да вышынь прафесійнага майстэрства і дасканаласці.

Штат прафесарска-выкладчыцкага саставу ўніверсітэта складае больш за 300 чалавек, з якіх 165 маюць вучоныя ступені і званні, 12 супрацоўнікаў маюць ганаровыя званні. Калектыў універсітэта – творчая супольнасць вядучых дзеячаў нацыянальнай культуры, вядомых навукоўцаў, педагогаў, маладых прадстаўнікоў інтэлектуальных і творчых сіл нашай краіны, якая імкнецца мэтанакіравана здзяйсняць праграму фіксацыі, вывучэння, захавання і трансляцыі традыцыйнай і сучаснай беларускай культуры ў самай шырокай разнастайнасці яе праяў. Добра аснашчаныя камп’ютарныя класы, спецыялізаваныя аўдыторыі, фанатэка, багатая вучэбная электронная бібліятэка, майстэрні ганчарства, саломапляцення, габелена, ткацтва, роспісу па тканіне, лозапляцення, старадаўніх беларускіх музычных інструментаў дазваляюць якасна арганізоўваць навучальны працэс, пашыраць магчымасці прафесійнага росту студэнтаў, паступовага набыцця імі навуковай і творчай сталасці.

Высокапрафесійны прафесарска-выкладчыцкі склад дае магчымасць Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту культуры і мастацтваў рыхтаваць спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, якія спалучаюць глыбокія спецыяльныя веды з грунтоўнай гуманітарнай падрыхтоўкай. У навучальны працэс укараняюцца сучасныя вучэбныя планы і праграмы, інфармацыйныя тэхналогіі і метады навучання. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў мае высокі рэйтынг сярод універсітэтаў Беларусі дзякуючы якаснай навуковай рабоце і інавацыйнай вучэбнай дзейнасці, шырокамаштабнай мастацкай творчасці. Універсітэт з надзеяй глядзіць у будучыню. Калектыў здольны вырашаць задачы падрыхтоўкі і выхавання адукаванай і прафесійна сталай нацыянальнай інтэлігенцыі, якая будзе ўносіць свой уклад у развіццѐ культуры, мастацтва і навукі Беларусі.

### *2.2 Нарматыўна-прававое і вучэбна-праграмнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу спецыяльнасці “сацыяльна-культурная дзейнасць”у вышэйшай школе*

Праграма вышэйшай прафесійнай адукацыі па падрыхтоўцы спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы, якая рэалізуецца ва ўніверсітэце, уключае: вучэбны план, праграмы вучэбных дысцыплін, праграмы вучэбных і вытворчых практык, парадак выканання дыпломнай работы, праграму дзяржаўнага экзамену, якія адпавядаюць патрабаванням адукацыйнага стандарту. Дзяржаўны адукацыйны стандарт вышэйшай прафесійнай адукацыі па спецыяльнасці “сацыяльна-культурная дзейнасць” з’яўляецца асновай адзіных патрабаванняў да прафесійных кампетэнцый выпускніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Структура базавага вучэбнага плана падрыхтоўкі спецыялістаў па сацыяльна-культурнай дзейнасці. За перыяд падрыхтоўкі студэнтамі вывучаюцца наступныя цыклы:

– сацыяльна-гуманітарных дысцыплін (Гісторыя Беларусі; Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы; Філасофія; Эканамічная тэорыя і Сацыялогія; Паліталогія; Беларуская мова (прафесійная лексіка); Замежная мова;

– прыродазнаўчых дысцыплін;

– агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін (Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю; Педагогіка і псіхалогія; Беларуская і сусветная літаратура; Гісторыя мастацтваў; Культуралогія; Сацыяльна-культурная дзейнасць; Менеджмент, маркетынг, фінансаванне, рэклама ва ўстановах сацыякультурнай сферы; Уводзіны ў спецыяльнасць; Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці; Методыка выкладання спецдысцыплін);

– дысцыплін спецыялізацыі і дысцыпліны, якія даюцца на выбар.

Абавязковым кампанентам падрыхтоўкі спецыяліста з’яўляецца практыка ў тым лікуазнаямленчая (вучэбная); вытворча-педагагічная; пераддыпломная.

Самастойная работа студэнтаў (СРС) ажыццяўляеццаў выглядзе аўдыторных і пазааўдыторныхформаў па кожнай дысцыпліне вучэбнага плана. На падставе бюджэту часу ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі, вучэбнымі планамі, рабочымі праграмамівучэбных дысцыплін устанаўліваюцца віды, аб’ём і змест заданняў па СРС. У арганізацыі самастойнай работы студэнту дапамагаюць распрацаваныя па кожнай дысцыпліне вучэбна-метадычны комплекс (ВМК) з матэрыяламі і рэкамендацыямі. Для ацэнкі якасці самастойнай работы студэнтаў ажыццяўляецца кантроль за яе выкананнем у форме, якая ўстанаўліваецца вну (гутарка, праверка і абарона індывідуальных заданняў, калёквіумы, кантрольныя работы, абарона курсавых праектаў (работ), тэсціраванне, залікі, вусныя і пісьмовыя экзамены і г.д.).

Асаблівая актуальнасць інстытута дадатковай адукацыі складаецца ў тым, што ён першапачаткова арыентаваны на свабодны выбар чалавекам відаў і формаў сацыяльна-культурнай, у прыватнасці адукацыйнай, дзейнасці, фарміраванне яго ўласных уяўленняў пра сусвет, развіццё здольнасцей. Дадатковая адукацыя, якбесперапынны працэс, не можа быць абмежавана ўзростам альбо сацыяльным статусам асобы, таму ў нашай краіне функцыянуюць не толькі ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей, але і ўстановы дадатковай адукацыі дарослых.

### *2.3 Спецыфіка прафесійнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці “сацыяльна-культурная дзейнасць” ва ўніверсітэце*

Кафедра педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці пачынае сваю гісторыю з 1975 года, калі быў заснаваны Мінскі інстытут культуры. Яна стваралася як кафедра культурна-асветніцкай работы. Першым загадчыкам кафедры прызначылі Ганчарова Ігара Юр'евіча, якога разам з супругай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Валянцінай Сямѐнаўнай запрасілі ў наш горад з Казані.У першыя гады існавання склад выкладчыкаў кафедры фарміраваўся з вучоных і спецыялістаў-практыкаў усяго вялікага Савецкага Саюза.

У 1982г. з адной вялікай кафедры культурна-асветніцкай работы выдзеліліся тры самастойныя:кафедра педагогікі і псіхалогіі;кафедра кіравання;кафедра методыкі і арганізацыі культурна-асветніцкай работы, якая з 1991г. стала звацца кафедрай педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

За 40-гадовую гісторыю кіраўнікамі нашай кафедры былі: Ганчароў Ігар Юр'евіч, Ганчарова Валянціна Сямѐнаўна, Сінельнікава Жана Міхайлаўна, Кручык Віктар Кірылавіч, Грыгаровіч Ядзвіга Дамінікаўна, Аўдзей Святлана Васільеўна, Наумчык Віктар Мікалаевіч. З 2008 г. загадчыкам кафедры стала кандыдат педагагічных навук, прафесар Казлоўская Людміла Іванаўна, а з 2021 кандыдат педагагічных навук Камоцкі Міхаіл Уладзіміравіч. Кафедра з'яўляецца выпускаючай па спецыяльнасці ―сацыяльна-культурная дзейнасць". Таксама кафедра ажыццяўляе падрыхтоўку магістраў і аспірантаў па спецыяльнасці ―Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці".

Кафедра з'яўляецца вядомым у рэспубліцы адукацыйным, навуковым, і навукова-метадычным цэнтрам у галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці. На кафедры існуе навуковая школа па праблемах сацыяльна-культурнай дзейнасці пад кіраўніцтвам доктара педагагічных навук, прафесара Малахавай Ірыны Аляксандраўны і кандыдата педагагічных навук, прафесара Казлоўскай Людмілы Іванаўны, а таксама навуковы студэнцкі гурток "Пошук".Кафедра падтрымлівае цесныя сувязі з навуковымі і навучальнымі ўстановамі краіны і бліжняга замежжа. Студэнты кафедры актыўна прымаюць удзел у Міжнародным фестывалі гульні "Гуляюць дзеці – гуляем мы" і з'яўляюцца яго лаўрэатамі і дыпламантамі. Кафедра распрацоўвае і ажыццяўляе інавацыйныя творчыя праекты для розных сацыякультурных і адукацыйных устаноў рэспублікі, беларускага тэлебачання. Штогод студэнтамі, магістрамі і выкладчыкамі кафедры ажыццяўляецца распрацоўка і пастаноўка больш за 100 сацыяльна-культурных і культурна-адпачынкавых праектаў.

Валанцѐрскі студэнцкі клуб "СЛОН" ажыццяўляе дапамогу дзіцячым дамам, цэнтрам рэабілітацыі, грамадскім аб'яднанням па арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Выпускнікі кафедры з'яўляюцца кваліфікаванымі спецыялістамі, сярод іх заслужаны работнік культуры Лазарава Лідзія Пятроўна, дырэктар Беларускай дзяржаўнай філармоніі Гарбар Александр Валянцінавіч, Каралѐў Мікалай Мікалаевіч – былы дэкан факультэта КіСКД БДУКМ, Камоцкая Алена Уладзіміраўна – загадчыца аддзела культуры Слуцкага раѐна,Туманава Таццяна Уладзіміраўна – дырэктар Віцебскага каледжа культуры і мастацтва, Вечар Аксана Мікалаеўна – вядучая беларускага тэлебачання і іншыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На кафедры працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты. Гэта кандыдаты навук, прафесары, дацэнты, а таксама вядомыя ў рэспубліцы спецыялісты ў галіне культуры і мастацтваў.

### *2.4 Фарміраванне ў Рэспубліцы Беларусь інфармацыйнага грамадства і значэнне Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі*

На цяперашнім этапе сусветнага развіцця інфармацыйная сфера набывае ключавое значэнне для сучаснага чалавека, грамадства, дзяржавы і аказвае значны ўплыў на эканамічныя, палітычныя і сацыяльныя працэсы ў краінах і рэгіёнах.Інфармацыйнае грамадства, якое фарміруецца ў глабальным маштабе, уяўляе сабой новы этап развіцця цывілізацыі з перавагай ведаў і інфармацыі, уздзеяннем інфармацыйных тэхналогій на ўсе сферы чалавечай дзейнасці.Кардынальна павышаецца роля інфармацыйных тэхналогій у рэалізацыі правоў і свабод грамадзян.

Разам з тым трансфармацыя соцыума ў інфармацыйнае грамадства нараджае новыя рызыкі і пагрозы, якія непасрэдна закранаюць пытанні забеспячэння нацыянальнай бяспекі, у тым ліку абароненасць інфармацыйнай прасторы, інфармацыйнай інфраструктуры, інфармацыйных сістэм і рэсурсаў.

Фарміраванне ў Рэспубліцы Беларусь інфармацыйнага грамадства, якое забяспечвае даступнасць інфармацыі, распаўсюджванне і выкарыстанне ведаў для паступальнага і прагрэсіўнага развіцця, разглядаецца як нацыянальны прыярытэт і агульнадзяржаўная задача.

Канцэпцыя ўяўляе сабой сістэму афіцыйных поглядаў на сутнасць і змест забеспячэння нацыянальнай бяспекі ў інфармацыйнай сферы, вызначае стратэгічныя задачы і прыярытэты ў галіне забеспячэння інфармацыйнай бяспекі.

Канцэпцыя забяспечвае комплексны падыход да праблемы інфармацыйнай бяспекі, стварае метадалагічную аснову для ўдасканалення дзейнасці па яе ўмацаванні, служыць падставай для фарміравання дзяржаўнай палітыкі, выпрацоўкі мер па ўдасканаленні сістэмы забеспячэння інфармацыйнай бяспекі, канструктыўнага ўзаемадзеяння, кансалідацыі намаганняў і павышэння эфектыўнасці абароны нацыянальных інтарэсаў у інфармацыйнай сферы.

Канцэпцыя засноўваецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, заканадаўстве Рэспублікі Беларусь у галінах нацыянальнай бяспекі, інфарматызацыі, развіцці лічбавай эканомікі, інфармацыйнага грамадства, навукі і тэхналогій, абароны інтэлектуальнай уласнасці, іншых актах заканадаўства.

Забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзяржаўнай палітыкай у гэтай галіне, якая ўключае фарміраванне, удасканаленне і рэалізацыю арганізацыйных, прававых, навукова-тэхнічных, праваахоўных, эканамічных мер забеспячэння нацыянальнай бяспекі ў інфармацыйнай сферы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Забяспечваецца канстытуцыйнае права грамадзян свабодна шукаць, атрымліваць, перадаваць, вырабляць, захоўваць і распаўсюджваць інфармацыю любым законным спосабам, права на таямніцу асабістага жыцця і іншую тайну, абарону персанальных дадзеных і аўтарскіх правоў, а таксама захаванне балансу правоў з абмежаваннямі, звязанымі з забеспячэннем нацыянальнай бяспекі Уводзяцца прававыя рэжымы бяспекі інфармацыі і інфармацыйных рэсурсаў, тэхнічныя ўмовы і палітыкі бяспекі. Ажыццяўляецца выяўленне і прыцягненне да ўстаноўленай законам адказнасці асоб, якія наносяць шкоду дзяржаўным інфармацыйным сістэмам, забяспечваецца дзяржаўная абарона інтарэсаў грамадзян і арганізацый незалежна ад форм уласнасці.

Не дапускаецца распаўсюджванне інфармацыі, накіраванай на прапаганду вайны, экстрэмісцкай дзейнасці або якая змяшчае заклікі да такой дзейнасці, спажывання наркатычных сродкаў і ім падобных рэчываў, парнаграфіі, насілля і жорсткасці, іншай інфармацыі, забароненай заканадаўствам. На дзяржаўным узроўні рэалізуюцца меры па перашкаджэнні распаўсюджвання інфармацыі, здольнай нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам, і недакладных звестак, а таксама па зніжэнню ананімнасці ў інфармацыйнай прасторы. Пры трансляцыі кантэнту недазваляецца прымяненне схаваных тэхналагічных прыёмаў, якія ўздзейнічаюць на падсвядомасць людзей або аказваюць шкодны ўплыў на іх здароўе.

**Тэма 3. Установа сацыяльна-культурнай сферы як сацыяльны інстытут**

3.1 Сацыяльныя інстытуты і сацыяльна-культурная дзейнасцьу грамадстве.

3.2 Сучасныя тыпы ўстаноў сацыяльна-культурнай сферы і іх класіфікацыя.

3.3 Дзейнасць установ сацыяльна-культурнай сферы па інфармацыйным забеспячэнні і суправаджэнні дзяржаўнай палітыкі.

***3.1 Сацыяльныя інстытуты і сацыяльна-культурная дзейнасць у грамадстве***

Сацыяльны інстытут вызначаецца як фіксаваная частка сацыяльнай арганізацыі грамадства, прызначаная для ўпарадкавання сумеснага жыцця і дзейнасці людзей для трансляцыі ведаў і традыцыйных элементаў культуры. Сацыяльны інстытут – гэта культуралагічная катэгорыя, паводле якой вялікая частка чалавечай дзейнасці выконваецца арганізаванымі групамі людзей, згодна з замацаванымі маральнымі і прававымі нормамі, і з выкарыстаннем пэўнай арганізацыйнай структуры. Сацыяльны інстытут не зводзіцца толькі да арганізацый або ўстаноў, якія займаюцца адведзенай ім дзейнасцю, хоць гэта асноўнае і найбольш прыкметнае ў працэсе інстытуалізацыі, – інстытут уключае ў сябе і віды мэтанакіраванай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці (напрыклад, рытуалы, святы), праз якія падтрымліваецца грамадскае жыццѐ. Інстытут як структурнае ўтварэнне складаецца з шэрагу кампанентаў:

1) сістэма функцый, замацаваных прадпісаннямі (нормы, статуты);

2) матэрыяльныя сродкі (будынак, фінансы, абсталяванне), якія забяспечваюць дзейнасць дадзенага інстытута;

3) носьбіты (кадры), якія дзейнічаюць у адпаведнасці з прынцыпамі дзейнасці дадзенага інстытута.

Сярод асноўных інстытутаў, якія займаюцца сацыяльна-культурнай дзейнасцю выдзяляюцца:

I. Сям'я, як першапачатковы сацыякультурны інстытут.

II. Дзяржаўныя інстытуты сацыяльна-культурнай дзейнасці – установы мастацтва, навукова-асветныя ўстановы, клубы, дамы і палацы культуры, кінатэатры, паркі культуры, цэнтры нацыянальных культур, дамы рамѐстваў, дамы і цэнтры народнай творчасці, санаторна-курортныя і спартыўна-аздараўленчыя ўстановы (санаторыі, пансіянаты, дамы адпачынку, прафілакторыі, лагеры і базы адпачынку, стадыѐны, спартыўныя залы, пляжы, басейны і г.д.). Яны выступаюць як паўнамоцныя суб'екты распрацоўкі і ажыццяўлення агульнадзяржаўнай культурнай палітыкі, якая знаходзіць адлюстраванне ў праграмах па захаванні і развіцці культуры, а таксама спрыяе фармаванню духоўнага і фізічнага здароўя грамадзян. Дзяржава валодае выключнымі правамі ў справе аховы нацыянальнага культурнага здабытку і цэласнасці нацыянальна значных музейных калекцый, бібліятэчных і архіўных фондаў.

Вылучым асноўныя прыярытэты дзяржаўнай культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь:

1. Падтрымка таленавітых дзяцей і моладзі (установа штогадовых прэмій, правядзенне розных конкурсаў, фінансаванне і развіццѐ школ мастацтваў, цэнтраў дзіцячай і маладзѐжнай творчасці).

2. Развіцця нацыянальнай беларускай культуры (падтрымка народных рамѐстваў, творчых калектываў, музычных і танцавальных аб'яднанняў).

3. Развіццѐ фізічнай культуры і здароўя нацыі (фінансаванне і развіццѐ аб'ектаў спартыўнага прызначэння, прапаганда здаровага ладу жыцця).

4. Ідэалагічнае выхаванне нацыі (выпрацоўка асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы, увядзенне абавязковага дня інфармавання, фінансаванне мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць патрыятычнаму выхаванню).

III. Сацыяльна-культурная дзейнасць грамадскіх і добраахвотных фарміраванняў. Пад грамадскімі і добраахвотнымі фарміраваннямі прынята разумець розныя фонды, рухі, таварыствы, ініцыятывы і г.д.. Часцей за ўсѐ яны рэагуюць на попыт, і ў сувязі з гэтым іх дзейнасць падтрымліваецца пэўнымі групамі насельніцтва. У межах дадзенага інстытута сацыяльна-культурнай дзейнасці можна вылучыць, з аднаго боку, таварыствы, якія маюць свае дамы культуры, у якіх арганізуецца вольны часіх членаў, з другога – рухі, асноўная дзейнасць якіх – правядзенне розных акцый (за

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

здаровы лад жыцця, чысты горад, супраць гвалту, супраць наркотыкаў і г.д.). Напрыклад, у цяперашні час сацыяльная абарона інвалідаў ажыццяўляецца як на ўзроўні дзяржавы, так і на ўзроўні грамадскіх арганізацый. Для дапамогі інвалідам па слыху і маўлення ў сацыяльнай адаптацыі створаны гарадскія, раѐнныя таварыствы інвалідаў. Гэтыя грамадскія арганізацыі аказваюць комплексную, дыферэнцыраваную сацыяльную дапамогу асобам з абмежаванымі магчымасцямі, скіраваную на максімальна магчымую рэабілітацыю і інтэграцыю гэтых людзей у грамадства. У структуры грамадскіх арганізацый маюцца навучальныя цэнтры, прадпрыемствы, рэабілітацыйныя і культурныя цэнтры. Іх задача – метадычная і арганізацыйная дапамога таварыствам інвалідаў у арганізацыі вольнага часу іх членаў, арганізацыя зносін непрацаздольных людзей, дапамога ім у адаптацыі і пашырэнні кругагляду, а таксама прапаганда і развіццѐ творчасці інвалідаў. Праца вядзецца па трох асноўных напрамках: мастацкая творчасць, спорт і вольны час.

### *3.2Сучасныя тыпы ўстаноў сацыяльна-культурнай сферы і іх класіфікацыя*

У кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры вызначана, што…

<u>Артыкул 3. Суб’екты культурнай дзейнасці</u>

Суб’ектамі культурнай дзейнасці з’яўляюцца:

- грамадзяне, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, работнікі культуры, творчыя работнікі, мецэнаты культуры;
- арганізацыі культуры, а таксама ўстановы адукацыі, навуковыя арганізацыі, іншыя юрыдычныя асобы і іх падраздзяленні, якія ажыццяўляюць і (або) забяспечваюць культурную дзейнасць;
- калектывы мастацкай творчасці, якія не з’яўляюцца арганізацыямі культуры і падраздзяленнямі юрыдычных асоб;
- творчыя саюзы, іншыя грамадскія аб’яднанні ў сферы культуры;
- дзяржаўныя органы і органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання;
- міжнародныя арганізацыі і міждзяржаўныя ўтварэнні;
- спонсары культуры; іншыя юрыдычныя асобы, якія садзейнічаюць захаванню, развіццю і распаўсюджванню і (або) папулярызацыі культуры.

<u>Артыкул 51. Віды і асноўныя тыпы арганізацый культуры</u>

1. Арганізацыі культуры па форме ўласнасці падзяляюцца на дзяржаўныя і прыватныя, па асноўнай мэце дзейнасці – на камерцыйныя і некамерцыйныя.

2. Арганізацыі культуры могуць быць створаны ў форме наступных камерцыйных арганізацый:

2.1. гаспадарчых таварыстваў (адкрытага або закрытага акцыянернага таварыства, таварыства з абмежаванай адказнасцю і таварыства з дадатковай адказнасцю), поўнага і камандытнага таварыстваў;

2.2. унітарных прадпрыемстваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Арганізацыі культуры могуць быць створаны ў форме наступных некамерцыйных арганізацый:

3.1. фінансуемых уласнікам устаноў культуры;

3.2. асацыяцый (саюзаў);

3.3. іншых формах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

4. Арганізацыі культуры ў залежнасці ад напрамкаў культурнай дзейнасці падраздзяляюцца на наступныя асноўныя тыпы:

4.1. бібліятэкі;

4.2. музеі;

4.3. арганізацыі народных мастацкіх рамёстваў;

4.4. арганізацыі кінематаграфіі;

4.5. тэатры;

4.6. цыркі;

4.7. філармоніі, ансамблі, хоры, аркестры, студыі, канцэртныя залы і іншыя канцэртныя арганізацыі;

4.8. клубы, палацы (дамы, цэнтры) культуры (мастацтваў), цэнтры (дамы) народнай творчасці (народнага мастацтва, фальклору), цэнтры (дамы) рамёстваў, маладзёжныя культурныя цэнтры, цэнтры нацыянальных культур і іншыя клубныя арганізацыі;

4.9. карцінныя, мастацкія галерэі і галерэі мастацтваў, выставачныя залы, панарамы і іншыя выставачныя арганізацыі;

4.10. паркі культуры і адпачынку, гарадскія сады, заапаркі, заасады;

4.11. творчыя майстэрні;

4.12. метадычныя цэнтры народнай творчасці (культурна-асветнай работы);

4.13. арганізацыі па правядзенні культурных мерапрыемстваў;

4.14. прадзюсарскія арганізацыі;

4.15. рэстаўрацыйныя арганізацыі;

4.16. іншыя тыпы.

5. Арганізацыі культуры, якія забяспечваюць стварэнне выканання твораў сцэнічнага мастацтва і іх публічнае выкананне, лічацца тэатральна-відовішчнымі. Да тэатральна-відовішчных арганізацый культуры адносяцца тэатры, цыркі, канцэртныя арганізацыі, іншыя тыпы арганізацый культуры, якія ажыццяўляюць указаную культурную дзейнасць.

6. Арганізацыі культуры, якія забяспечваюць доступ грамадзян да культурных каштоўнасцей, што знаходзяцца ў фондах гэтых арганізацый, або ствараюць умовы для занятку народнай і мастацкай творчасцю, самаадукацыяй, а таксама для культурнага развіцця, лічацца культурна-асветнымі. Да культурна-асветных арганізацый культуры адносяцца музеі, бібліятэкі, клубныя арганізацыі, іншыя тыпы арганізацый культуры, якія ажыццяўляюць указаную культурную дзейнасць.

7. У мэтах забеспячэння ўмоў комплекснага прадастаўлення культурных даброт насельніцтву, а таксама аптымізацыі дзейнасці арганізацый культуры могуць ствараецца арганізацыі культуры змешанага тыпу. Да арганізацый культуры змешанага тыпу адносяцца арганізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры, у структуру якіх уваходзяць падраздзяленні, у тым ліку адасобленыя, што ажыццяўляюць культурную дзейнасць розных напрамкаў.

8. Асаблівасці стварэння, прававога становішча і парадку дзейнасці асобных тыпаў арганізацый культуры вызначаюцца гэтым Кодэксам.

Артыкул 55. Установы адукацыі ў сферы культуры

Да ўстаноў адукацыі ў сферы культуры адносяцца ўстановы агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, а таксама ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і дадатковай адукацыі дарослых, якія падпарадкоўваюцца Міністэрству культуры або структурным падраздзяленням мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры.

Установы можна падзяліць таксама на аднапрофільныя і шматпрофільныя.

Да аднапрофільных можна аднесці тыя арганізацыі, якія арыентаваны на адзін або некалькі роднасных відаў дзейнасці (напрыклад, рок-клуб, рок-лабараторыя, дом рамѐстваў, дом фальклору, тэатральныя майстэрні, клуб самадзейнай песні, сацыяльна-экалагічны саюз, цэнтр сучаснага мастацтва (выяўленчага ) і г.д.

Шматпрофільныя арганізацыі спалучаюць розныя прадметныя напрамкі і віды дзейнасці. Гэта – розныя цэнтры, асацыяцыі, аб'яднанні. Напрыклад, цэнтры вольнага часу (хобі-цэнтры, нацыянальна-культурныя цэнтры і інш.); асацыяцыі, таварыствы, якія аб'ядноўваюць дзеячаў прафесійнага мастацтва (асацыяцыя мастакоў, таварыства кампазітараў, асацыяцыя дзеячаў эстраднага мастацтва), а таксама непрафесіяналаў або спалучаюць тых і іншых; асацыяцыі, саюзы, аб'яднанні, якія ўключаюць розныя арганізацыі і нават ўстановы – напрыклад, асацыяцыя дзіцячых і юнацкіх клубаў, асацыяцыя музеяў касманаўтыкі і г.д.

### *3.3 Дзейнасць устаноў сацыяльна-культурнай сферы па інфармацыйным забеспячэнні і суправаджэнні дзяржаўнай палітыкі*

Ва ўмовах глабальнай інфарматызацыі грамадства і нарастальнай хуткасці праходжання ўсіх сацыяльных працэсаў, асноўная роля ў фармаванні каштоўнасных арыентацый асобы і грамадства, захаванні гістарычнай памяці пераходзіць да медыякультуры, сродкаў масавай інфармацыі (далей – СМІ).

Сѐння ў інфармацыйнай прасторы найбольш актыўна развіваюцца новыя медыя – мультымедыйныя шматканальныя персаналізаваныя інтэрнэт-рэсурсы. Інтэрнэт даўно стаў адной з асноўных крыніц атрымання навін і прасторай для зносін.

Так, па дадзеных кампаній "We Are Social" і "Hootsuite", адлюстраваным у справаздачы аб стане лічбавай сферы "Global Digital", у студзені 2021 г. ва ўсім свеце Інтэрнэтам карысталіся 4,66 мільярда чалавек. Такім чынам, узровень пранікнення Інтэрнэту ў свеце складае 59,5%: доступ да яго ѐсць больш за ў паловы насельніцтва зямнога шара.У Беларусі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзровень пранікнення значна вышэйшы – больш за 85% жыхароў нашай краіны з'яўляюцца карыстальнікамі Інтэрнэту.Сацыяльныя медыя (сацыяльныя сеткі і месэнджэры) з'яўляюцца адным з найболей папулярных інтэрнэт-рэсурсаў. У свеце налічваецца 4,2 мільярда іх карыстальнікаў (53,6% сусветнага насельніцтва). У сярэднім кожны дзень на працягу 2020 г. у сацыяльных медыя стваралася больш за 1,3 мільѐна новых акаўнтаў, што складае прыкладна 15,5 новых карыстальнікаў у секунду. Такім чынам, з кожным годам усѐ больш інтэрнет-карыстальнікаў атрымліваюць інфармацыю, матэрыялы СМІ праз сацыяльныя сеткі і месэнджэры.Радавы карыстальнік сацыяльных медыя зараз праводзіць на гэтых платформах 2 гадзіны 25 хвілін кожны дзень, што адпавядае прыкладна аднаму дню ў тыдзень за вылікам часу на сон.

У Беларусі, паводле дадзеных справаздачы "Digital 2021" і ўнутранай статыстыцы інтэрнэт-платформаў, значная доля трафіку беларусаў таксама прыпадае на мэсэнджэры і сацыяльныя сеткі.

Інтэрнэт дазваляе атрымаць хуткі доступ да рознага роду інфармацыі, быць у курсе апошніх навін, аператыўна дзяліцца імі са сваім асяроддзем. Разам з тым, якасць інфармацыі ў Інтэрнеце не заўсѐды адназначная. Так, нярэдка ў Сеткі можна сустрэць неправераныя, а часам – і мэтанакіравана скажоныя звесткі, "фейкі". Інфармацыйная агрэсія на глабальным і нацыянальным узроўнях перастае быць рэдкасцю, становячыся цэнтральным звяном гібрыдных войн.

Таму відавочна, што сѐння менавіта кантэнт нацыянальных СМІ і інтэрнет-рэсурсаў, узровень медыякультуры насельніцтва, становяцца аднымі з ключавых фактараў, якія абумоўліваюць характар праходжання розных сацыяльных працэсаў у нашай краіне.

Па выніках даследавання, праведзенага на замову Міністэрства інфармацыі ў 2020 г. Цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ, грамадзяне Беларусі часцей за ўсѐ звяртаюцца да такіх крыніц інфармацыі, як сацыяльныя сеткі і тэлебачанне (59,8% і 59,4% адпаведна). Кожны другі рэспандэнт чытае інфармацыйныя і навінавыя сайты (49,4%), кожны трэці выкарыстоўвае месэнджары (34,4%).Важным паказчыкам у ацэнцы медыяспажывання з'яўляецца першачарговасць выбару крыніцы інфармацыі на працягу дня. Як паказваюць вынікі вышэй абазначанага даследавання, жыхары рэгіѐнаў Беларусі пачынаюць свой інфармацыйны дзень пераважна з прагляду тэлеперадач (35,1%) або наведвання сацыяльных сетак (33,7%). На трэцім месцы з істотным адставаннем знаходзяцца інфармацыйныя і навінавыя сайты (14,1%).

Такім чынам, даступнасць Інтэрнэту шырокай аўдыторыі вывела глабальную сетку ў разрад кіроўных крыніц інфармацыі. Рэаліі такія, што віртуальнае асяроддзе сѐння стала наймагутным фактарам уплыву на насельніцтва і адпаведна можа стаць добрым сродкам для ўстаноў сацыяльна-культурнай сферы па інфармацыйным забеспячэнні і суправаджэнні дзяржаўнай палітыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 4. Прафесійная кампетэнтнасць – аснова канкурэнтаздольнасці спецыяліста

4.1 Асноўныя паняцці ў галіне прафесійнай кампетэнтнасці.

4.2 Аналіз айчыннага рынку працы і патрабаванні да спецыялістаў па сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сучасных умовах.

4.3 Роля партфоліа ў канкурэнтаздольнасці спецыяліста.

### *4.1 Асноўныя паняцці ў галіне прафісійнай кампетэнтнасці*

**Спецыяльнасць** – від прафесійнай дзейнасці, які патрабуе пэўных ведаў, уменняў і кампетэнцый, набываемых шляхам навучання і практычнага вопыту (ОКРБ 011).

**Кваліфікацыя** – веды, уменні і навыкі, неабходныя для той ці іншай прафесіі на рынках працы, падцверджаныя дакументам (СТБ 22.0.1).

**Кампетэнцыя** – веды, уменні і вопыт, неабходныя для вырашэння тэарэтычных і практычных задач

Падрыхтоўка спецыяліста па сацыяльна-культурнай дзейнасці забяспечвае фарміраванне наступных груп кампетэнцый: *акадэмічныя кампетэнцыі*, якія ўключаюць веды і ўменні па вывучаных дысцыплінах, здольнасці і ўменні вучыцца; *сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі*, якія ўключаюць культурна-каштоўнасныя арыентацыі, веды ідэалагічных, маральных каштоўнасцей грамадства і дзяржавы,уменне кіравацца імі; *прафесійныя кампетэнцыі*, якія ўключаюць веды і ўменні выяўляць праблемы, рашаць задачы, распрацоўваць планы і забяспечваць іх выкананне ў выбранай сферы прафесійнай сацыяльна-культурнай дзейнасці, здольнасці весці педагагічна-выхаваўчую работу. Таму што выпускнік вну павінен быць кампетэнтным у наступных відахдзейнасці:– вучэбна-педагагічнай;– інавацыйна-метадычнай; – арганізацыйна-кіруючай; – навукова-даследчай.

Спецыяліст павінен мець наступныя акадэмічныя кампетэнцыі:

– валодаць і выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач;

– валодаць даследчымі навыкамі;

– умець працаваць самастойна;

– быць здольным ініцыіраваць новыя ідэі;

– валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем;

– выкарыстоўваць лінгвістычныя навыкі;

– умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця, ведаць месца і ролю ў ім сваѐй прафесійнай дзейнасці, праблемы і тэндэнцыі ўстойлівага развіцця;

– умець самастойна прымаць прафесійныя рашэнні з улікам іх сацыяльных і экалагічных наступстваў;

– бесперапынна папаўняць свае веды, аналізаваць гістарычныя і сучасныя праблемы эканамічнага і сацыякультурнага жыцця грамадства.

Неабходны наступныя сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– валодаць якасцямі грамадзяніна;
– быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
– валодаць здольнасцю да міжасабовых камунікацый;
– валодаць навыкамі зберажэння здароўя;
– быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;
– умець працаваць у калектыве.

Прафесійныя кампетэнцыі па відах дзейнасці,вызначаюцца здольнасцямі:

*у вучэбна-педагагічнай дзейнасці:*

– арганізоўваць пазнавальную і творчую дзейнасць розных сацыяльных і ўзроставых груп ва ўстановах сферы культуры;

– арганізоўваць інфармацыйна-асветніцкую і выхаваўчую работу па месцы жыхарства;

– папулярызаваць здаровы лад жыцця;

– уключаць людзей у працэс бесперапыннай адукацыі, сацыяльна-культурнай творчасці і рэкрэацыйна-забаўляльнага вольнага часу;

– ажыццяўляць сацыяльна-культурную падтрымку людзей з асаблівасцямі фізічнага развіцця;

– аказваць дапамогу ў сямейным выхаванні дзяцей;

– набываць новыя веды, выкарыстоўваючы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі;

*у інавацыйна-метадычнай дзейнасці:*

– ацэньваць стан, тэндэнцыі, вызначыць дынаміку і перспектывы развіцця сацыяльна-культурнай сферы;

– здзяйсняць сацыяльна-культурную дзейнасць на аснове вывучэння запытаў і інтарэсаў з улікам узросту, адукацыі, нацыянальных, сацыягендэрных і іншых адрозненняў розных груп насельніцтва;

– выяўляць інтарэсы і педагагічныя патрэбнасці насельніцтва ў розных відах культурна-адпачынкавай дзейнасці;

– распрацоўваць сацыяльна-культурныя праграмы па арганізацыі вольнага часу ў канкрэтным мікрасоцыуме і ва ўстановах featuresрознага тыпу;

*у арганізацыйна-кіруючай дзейнасці:*

– працаваць з юрыдычнай літаратурай і працоўным заканадаўствам;

– арганізоўваць работу творчых калектываў па дасягненні пастаўленых мэтаў, планаваць фонды аплаты працы;

– кантраляваць і падтрымліваць працоўную і вытворчую дысцыпліну;

– складаць дакументацыю (графікі работ, інструкцыі, планы, заяўкі, дзелавыя пісьмы і т.п.) па ўстаноўленых формах;

– распрацоўваць, прадстаўляць і ўзгадняць прадстаўляемыя матэрыялы;

– эфектыўна выкарыстоўваць вылічальную, аудыа-відэа тэхніку, сучасныя сродкі камунікацыі;

*у навукова-даследчай дзейнасці:*

– займацца навукова-даследчай дзейнасцю ў галіне гісторыі, тэорыі і арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– аналізаваць і ацэньваць сабраныя звесткі;

– на навуковай аснове арганізоўваць сваю працу, выкарыстоўваць камп’ютэрныя метады збора, захавання і апрацоўкі інфармацыі ў сферы прафесійнай дзейнасці.

### *4.2 Аналіз айчыннага рынку працы і патрабаванні да спецыялістаў па сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сучасных умовах*

*Спецыяліст па сацыяльна-культурнай дзейнасці* павінен мець дастатковы ўзровень ведаў і ўменняў ў сферы сацыяльна-гуманітарных, прыродазнаўчых, агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін, дысцыплін спецыялізацыі для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці. Акрамя таго неабходна валодаць дзяржаўнымі мовамі (беларускай, рускай), адной ці некалькімі замежнымі мовамі, аналізаваць гістарычныя і сучасныя праблемы сацыяльна-эканамічнага і духоўнага жыцця грамадства, ведаць ідэалогію беларускай дзяржавы, маральныя і прававыя нормы, умець улічваць іх у сваёй жыццядзейнасці; быць здольным да пастаяннага прафесійнага, культурнага і фізічнага самаўдасканалення.

Мяняюцца сучасныя крытэрыі гатоўнасці да прафесійнай дзейнасці, патрабаванні да адбору спецыялістаў пры ўладкаванні на працу – ѐн павінен валодаць юрыдычнымі і эканамічнымі ведамі, паколькі сацыяльна-культурная сфера носіць як некамерцыйны, так і камерцыйны характар.Такі спецыяліст павінен быць гатовы да пастаяннай працы над павышэннем уласнага прафесійнага ўзроўню, умець рэгуляваць і каардынаваць дзейнасць калектыву, быць камунікабельным, любіць людзей. Такім чынам, спецыяліст, які працуе сѐння ў сацыяльна-культурнай сферы,– асоба разнапланавая, якая спалучае ў сабе якасці кіраўніка, эканаміста, арганізатара, творцы, сацыяльнага работніка, педагога, псіхолага, рэкламіста, спецыяліста па сувязях з грамадскасцю і г.д. Пра такіх можна сказаць, што гэта Богам адзначаныя асобы.

Расійскі прафесар Н.К. Бакланава вызначае аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары, якія ўплываюць на станаўленне прафесійнага майстэрства. Яна звяртае ўвагу на тое, што прафесійнае майстэрства ўяўляе сабой сістэму ведаў, уменняў, навыкаў і прафесійна важных псіхічных уласцівасцяў і якасцяў асобы, якія адказваюць патрабаванням прафесіяналізму і неабходны для станаўлення майстэрства.Вылучаюцца тры групы аб'ектыўных ведаў, уменняў і навыкаў: арганізацыйна-педагагічныя (тэхналагічныя), сацыяльна-псіхалагічныя і псіхолага-педагагічныя.Суб'ектыўныя фактары ўключаюць якасці, якія характарызуюць індывідуальнасць асобы, унікальнасць яе майстэрства. Да іх можна аднесці:характар інтарэсаў спецыяліста(вызначае сістэму яго каштоўнасных арыентацый);ступень развіцця здольнасцяў, псіхічных уласцівасцяў, якасцей, асаблівасцяў пазнавальнай, эмацыйнай і валявой сферы;узровень засваення прафесійнай дзейнасці.Прафесійная накіраванасць інтарэсаў асобы знаходзіць адлюстраванне ў адэкватным разуменні і прыняцці мэтаў і задач прафесійнай дзейнасці, наяўнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сфармаваных прафесійных матываў, ўстойлівых пераваг, схільнасцей, поглядаў, перакананняў, ідэалаў, установак, якія адносяцца да абранай прафесіі. Яшчэ адна група якасцяў, якія з'яўляюцца неабходнай умовай станаўлення майстэрства, грунтуецца на развіцці разумовых працэсаў і праяўляюцца ў знаходжанні вырашэння кіраўніцкіх, арганізацыйных, творчых задач.Наступная група якасцяў, неабходных для станаўлення прафесійнага майстэрства спецыяліста, заснавана на развіцці прафесійнай самасвядамасці, яны праяўляюцца ва ўсведамленні асобай самой сябе ў прафесійнай дзейнасці. Бяспрэчна, што майстэрства спецыяліста не з’яўляецца чымсьці застылым і не схільным да зменаў, наадварот, у залежнасці ад развіцця пералічаных вышэй якасцяў, яно змяняецца, пераходзячы з аднаго ўзроўню на другі, – удасканальваецца або дэградуе.

Можна зрабіць наступныя высновы пра фактары, якія ўплываюць на фарміраванне прафесійнага майстэрства спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы:

1. Прафесійнае майстэрства праяўляецца ў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

2. Асновы прафесійнага майстэрства можна фармаваць у працэсе навучання.

3. Фарміраванне прафесійнага майстэрства напрамую залежыць ад творчай актыўнасці, дзейнасці і самастойнасці будучага спецыяліста.

4. Майстэрства характарызуецца высокім узроўнем развіцця спецыяльных абагульненых ўменняў.

5. Майстэрства заснавана на якасцях асобы, якія забяспечваюць паспяховую прафесійную дзейнасць.

Майстэрства спецыяліста знаходзіцца ў пастаянным развіцці, пераходзячы з аднаго якаснага стану ў іншы.

Абагульняючы разгляд прафесійных каштоўнасцяў і якасцей асобы спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці, можна прапанаваць нейкую ідэальную мадэль спецыяліста.Спецыяліст сацыяльна-культурнай дзейнасці павінен валодаць шырокім кругаглядам, быць знаўцам сусветнай і нацыянальнай культуры, чалавечых адносін, псіхолагам і педагогам, які стымулюе дзеянні калег на павышэнне культурнага ўзроўню насельніцтва, развіццё яго духоўнага патэнцыялу.Спецыяліст сацыяльна-культурнай дзейнасці – чалавек неабыякавы да болю іншага і «язваў» грамадства. Спецыяліст віртуозна валодае прыёмамі, спосабамі і метадамі ўплыву на аўдыторыю. Ён валодае эмацыйна-вобразнай памяццю, творчай фантазіяй і ўяўленнем, вобразным мысленнем, ярка выяўленай цягай да пошуку нетрывіяльных, нестандартных шляхоў вырашэння актуальных праблем, новых, арыгінальных, дзейсных формаў уплыву на аўдыторыю.Ён шырока выкарыстоўвае сацыялагічныя і іншыя даследчыя метады ў распрацоўцы сацыяльна-культурных праектаў, валодае аналітычным мысленнем, навукова абгрунтавана фармулюе «праблемнае поле» канкрэтнага соцыума.Спецыяліст сацыяльна-культурнай дзейнасці ўмее «заразіць» супрацоўнікаў сваёй ідэяй, адабраць неабходных людзей для стварэння і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ажыццяўлення праекта, абгрунтавана даказаць неабходнасць распрацоўкі творчага праекта і пераканаўча адстаяць асноўныя яго пазіцыі, прыцягнуць да дзейнасці шырокую грамадскасць. Віртуозна валодае сакрэтамі камунікатыўнай культуры.Ён умее сфармуляваць мэты і задачы, прыняць своечасовыя рашэнні, актуальныя для канкрэтнага часу. Такі ідэальны спецыяліст у дасканаласці валодае арганізацыйна-кіраўнічымі тэхналогіямі, умее наладзіць кантакты з дзяржаўнымі, грамадскімі і камерцыйнымі (прыватнымі або акцыянернымі таварыствамі), прыцягнуць людскія, матэрыяльныя рэсурсы і фінансавыя сродкі на ажыццяўленне распрацаванага праекта, правільна спланаваць, размеркаваць заданні і адказнасць, ажыццяўляць кантроль над якасцю выканання заданняў, выбраць адэкватныя формы заахвочвання ці спагнання. Ён валодае высокімі маральнымі прынцыпамі, справядлівы і аб'ектыўны. З'яўляецца прыкладам адказных адносін да абавязкаў, носьбітам карпаратыўнай культуры, культуры кіраўнічай працы, пастаянна працуе над удасканаленнем уласнага іміджу і навучае гэтаму іншых супрацоўнікаў і наведвальнікаў установы культуры.Ён увесь час працуе над павышэннем свайго прафесійнага майстэрства, культурнага патэнцыялу, удасканальвае сацыяльна-культурныя тэхналогіі.

### *4.3 Роля партфоліа ў канкурэнтаздольнасці спецыяліста*

Адным са сродкаў, якія дазваляе адлюстраваць развітыя прафесійныя ўменні і ў той жа час, служыць сродкам маніторынгу і ацэнкі, з'яўляецца партфоліа. Партфоліа, як новы сродак ацэньвання, непарыўна звязаны з ідэй навучання на працягу ўсяго жыцця. Прыняцце і далейшае развіццѐ парадыгмы практыка-арыентаванага навучання прывяло да выкарыстання альтэрнатыўных метадаў ацэньвання, у тым ліку ацэньванню пры дапамозе партфоліа (portfolio assessment). Дадзены метад выкарыстоўваюць, перш за ўсѐ, у навучанні, заснаваным на кампетэнтнасным падыходзе. Па сутнасці, партфоліа з'яўляецца толькі часткай, канкрэтным відам так званага «аўтэнтычнага ацэньвання». Паняцце «аўтэнтычнае ацэньванне» шмат у чым раўназначна дэфініцыі «сапраўднае, дакладнае ацэньванне», часам выкарыстоўваецца тэрмін «сапраўдная ацэнка», або «ацэньванне рэальных дасягненняў вучняў». Неабходнасць распрацоўкі аўтэнтычнага ацэньвання звязваецца сѐння з тэарэтычнымі палажэннямі аб тым, што неабходна такая парадыгма адукацыі, якая дасць магчымасць не толькі і не столькі засвойваць і запамінаць інфармацыю, выкарыстоўваць алгарытмы для вырашэння невялікіх праблем, але, перш за ўсѐ, падрыхтаваць да выяўлення праблемы, знаходжанню інфармацыі для яе вырашэння, ацэньвання альтэрнатыў, стварэння ідэй і прадуктаў, распрацоўцы новых рашэнняў складаных дылем.

Партфоліа таксама дазваляе спецыялісту больш шырока і разнастайна прэзентаваць свае дасягненні, уменні і напрамкі дзейнасці, выходзячы за рамкі толькі прафесійнай дзейнасці. Следствам выкарыстання прафесійнага партфоліа можа стаць з'яўленне новага аспекты – аспекту развіцця,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самаарганізацыі і самакантролю ў планаванні прафесійнай кар'еры. Істотным становіцца перанос акцэнта на самакантроль і праектаванне сваѐй прафесійнай траекторыі. Падкрэсліваецца, што спецыяліст праз партфоліа ажыццяўляе праектаванне ўласнага прафесійнага развіцця, які носіць доўгачасовы характар, адпавядае сучаснай ідэалогіі навучання на працягу ўсяго жыцця, і вынікі якога ѐн прадстаўляе на разгляд экспертаў.

1. Партфоліа спецыяліста афармляецца ў двух версіях –у друкаваным і ў электронным выглядзе.

2. Кожны асобны матэрыял, які ўключаны ў партфоліа, павінен датавацца.

3. Склад партфоліа залежыць ад канкрэтных задач, якія ставіць перад сабой сам педагагічны работнік.

Партфоліа як збор прац і дасягненняў спецыяліста, якія даюць уяўленне аб узроўні яго майстэрства і практычнага вопыту ў прафесійнай дзейнасці, наглядна дэманструюць і пацвярджаюць узровень кваліфікацыі, досведу, таленту, крэатыўнасці і прафесійных магчымасцях яго ўладальніка, неабходнасць пачынаць фарміраваць з першых крокаў працы ў прафесіі.

## Тэма 5. Сацыяльна-культурная дзейнасць і навука. Сучасныя тэндэнцыі развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь

5.1 Эвалюцыя і катэгарыяльны апарат сацыяльна культурнай дзейнасці.

5.2 Навуковая інфармацыя і сучасныя крыніцы яе атрымання.

### *5.1 Эвалюцыя і катэгарыяльны апарат сацыяльна культурнай дзейнасці*

Віды сацыяльна-культурнай дзейнасці складваліся гістарычна, паступова афармляліся ў сістэму, якая выконвае пасрэдніцкія функцыі паміж асобай і светам культуры. Як адзначалася раней сацыяльна-культурная дзейнасць – гэта абумоўленая маральна-інтэлектуальнымі матывамі грамадска мэтазгодная дзейнасць па стварэнні, асваенню, захаванню, распаўсюджванню каштоўнасцяў культуры.

Узнікненне і дыялектычнае развіццѐ катэгоры ―СКД” звязаны з філасофскім, культуралагічным, педагагічным, сацыльна-псіхалагічным тлумачэннем тэрміну. Папярэднія паняцці ―адукацыя”, ―асвета”, ―пазашкольнае выхаванне”, ―палітыка-асветніцкая праца”, ―культурна-асветніцкая работа”, ―культурна-масавая работа” на працягу гадоў самі неаднаразова змянялі свой змест. Так у айчыннай навуцы паняцце СКД змяніла паняцце ―культурна-асветніцкая работа”, якое было агульна прынята ў савецкі час, як масавы інструмент ідэалагічнай работы камуністычнага выхавання насельніцтва. Не выпадкова з’яўленню гэтага тэрміну папярэднічала палітыка-асветніцкая дзейнасць (палітасвет), з якой звязана культурная рэвалюцыя 20 – 30-х гадоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэнезіс навуковай тэорыі прадстаўлены ў выглядзе наступных навуковых канцэптаў:

– пазашкольная,

– палітыка-асветніцкая дзейнасць,

– клубная справа,

– культурна-асветніцкая праца,

– культурна-адпачынкавая дзейнасць,

– сацыяльна-культурная дзейнасць.

Па меры росту новых ведаў, пашырэння сферы пранікнення навуковай думкі ў рэальнае жыццѐ, па меры ўзнікнення новых праблем і патрэбаў грамадства назіраюцца тэндэнцыі дыферэнцыяцыі і спецыялізацыі навук, г.зн. падзелу асноўны навукі на шэраг больш прыватных абласцей, якія развіваюцца самастойна. З іншага боку, у вырашэнні шэрагу праблем назіраецца з'ява інтэграцыі – аб'яднання шэрагу самастойных навук, якія вывучаюць адзін аб'ект, але з розных пунктаў гледжання.

Сацыяльна-культурная дзейнасць сѐння разглядаецца як сфера сацыяльна-культурнай практыкі і як самастойная галіна навуковых ведаў. Прадмет сацыяльна-культурнай дзейнасці ўяўляе сабой працэс далучэння асобы да каштоўнасцяў культуры праз арганізацыю актыўнай, ініцыятыўнай, творчай дзейнасці. Такім чынам, сацыяльна-культурная дзейнасць мае справу не столькі з вынікамі культурнай дзейнасці, колькі з працэсам асваення каштоўнасцяў культуры. У сацыяльна-культурнай дзейнасці на першае месца вылучаецца камунікатыўны кампанент культуры – узровень зносін розных сацыяльных груп і супольнасцяў, з дапамогай якога ажыццяўляецца трансляцыя культурных каштоўнасцяў, адбываецца культурны абмен. Усе гэтыя меркаванні даюць магчымасць зрабіць некаторыя высновы аб прадмеце і задачах СКД як навуковай дысцыпліны. Яе прадметам выступае працэс уключэння асобы ў культуратворчую дзейнасць.

Аб'ектам з'яўляецца асоба ў сістэме сацыяльна-культурных сувязяў і адносін. Дзейнасць як аснова чалавечага быцця, спецыяльная форма праявы актыўнасці чалавека, шматгранны працэс, які сам здольны ахарактарызаваць пэўны тып адносін да свету і тып быцця ў свеце.

Сацыяльна-культурная дзейнасць як навуковая дысцыпліна цесна звязаная з педагогікай, і ў поле яе зроку знаходзяцца працэсы і з'явы, якія вывучаюцца педагогікай, але разглядаюцца ў вызначаным, спецыфічным ключы: педагагічны працэс, сродкі, формы, метады і інш. ў сферы вольнага часу. Сувязь з педагогікай абумоўлена тым, што сацыяльна-культурная дзейнасць носіць развіваючы характар, здольна аказваць накіраванае ўздзеянне на асобу. Гэты працэс ажыццяўляецца на аснове шмат у чым агульных з педагогікай заканамернасцяў.

Такім чынам, тэорыя СКД з’яўляецца адной з частак тэорыі педагогікі, агульнапедагагічнай сістэмы навуковых ведаў. Яна абапіраецца на фундаментальныя для педагагічнай навукі палажэнні з галіны чалавеказнаўства, сацыялогіі, псіхалогіі, гісторыі, культуралогіі і г.д., пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чым развівае іх. У сваю чаргу, тэорыя СКД з’яўляецца базавай галіной навуковых ведаў для мноства больш вузкіх спецыяльных дысцыплін, якія ўваходзяць у адукацыйныя стандарты падрыхтоўкі кадраў для сферы мастацтва, СМІ, турызму, інфармацыйных тэхналогій і іншых.

### *5.2 Навуковая інфармацыя і сучасныя крыніцы яе атрымання*

Праца з навуковай інфармацыяй пачынаецца з вызначэння асноўных паняццяў па тэме даследавання, каб выкарыстанне іх было адназначным (паняцце ў навуцы рознымі аўтарамі можа трактавацца па-рознаму). Пасля таго, як вызначэнне паняццяў зроблена, пачынаецца пошук іх тлумачэнняў у наступных крыніцах:

• энцыклапедыі: агульныя і спецыяльныя (напрыклад, педагагічная, псіхалагічная, філасофская і інш.);

• тлумачальныя слоўнікі: агульныя і спецыяльныя (напрыклад, педагагічны, псіхалагічны, сацыялагічны);

• змест і прадметныя паказальнікі асноўных падручнікаў і манаграфій па тэме даследавання.

Знойдзеныя вызначэння паняццяў фіксуюцца і падвяргаюцца разумовай апрацоўцы з дапамогай аперацый аналізу, параўнання, класіфікацыі, абагульнення і інш.

Для значнай часткі студэнтаў найбольш блізкімі з'яўляюцца традыцыйныя, друкаваныя крыніцы інфармацыі. Пошук крыніц інфармацыі суправаджаецца складаннем бібліяграфіі – спісу прац, якія падлягаюць вывучэнню, навуковаму апісанню. Бібліяграфія звычайна ўключае кнігі, падручнікі, вучэбныя і вучэбна-метадычныя дапаможнікі, часопісы, артыкулы ў навуковых і метадычных зборніках, тэзісы дакладаў на рознага ўзроўню канферэнцыях, манаграфіі, рэфератыўныя агляды, аўтарэфераты дысертацый і інш.

Часта пры аналізе праблемы разам з друкаванымі матэрыяламі даводзіцца прыцягваць матэрыялы рукапісныя:

• дысертацыйныя працы па тэме даследавання,
• аўтарэфераты,
• справаздачы аб навукова-даследчых працах;
• матэрыялы гістарычных і бягучых архіваў
• справаздачы, пратаколы пасяджэнняў, акты;
• даклады і паведамленні;
• бягучая дакументацыя навучальных устаноў (планы работ, дакументацыя, загады і распараджэнні кіраўнікоў, вынікі кантрольных праверак і г.д.).

Сёння шырока выкарыстоўваюцца магчымасці па пошуку інфармацыі з дапамогай Інтэрнэту. Дадзены рэсурс разглядаецца як асноўны, калі выкарыстоўваюцца крыніцы з афіцыйных сайтаў і навуковых электронных бібліятэк, і як дадатковы, калі інфармацыя носіць неафіцыйны характар. Пры выкарыстанні якой-небудзь інфармацыі, размешчанай у Інтэрнэт, у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

варта ўказваць назву сайта, з якога ўзята інфармацыя, у бібліяграфічным спісе.

Навуковыя выданні адлюстроўваюць ход і вынікі даследаванняў у розных галінах навукі, тэхнікі, культуры. Іх выпуск з'яўляецца паказчыкам навукова-тэхнічнага прагрэсу, галоўным сродкам узаемнай інфармацыі навукоўцаў аб даследаваннях, якія імі праводзяцца. Найважнейшымі іх разнавіднасцямі з'яўляюцца: працы класікаў навукі; абагульняючыя працы па гісторыі навук, якія выходзяць часцей за ўсё ў выглядзе шматтомных выданняў; зборнікі навуковых прац па найбольш актуальных тэмах і праблемах; манаграфіі; матэрыялы навуковых кангрэсаў і канферэнцый. Манаграфія – вельмі распаўсюджаная разнавіднасць навуковых выданняў. Гэта глыбокае і ўсебаковае даследаванне адной тэмы, праблемы. Вялікае значэнне маюць матэрыялы навуковых кангрэсаў, канферэнцый, нарад, на якіх вырашаюцца надзѐнныя пытанні тэарэтычнага і практычнага характару.

Навукова-папулярныя выданні характарызуюць дасягненні навукі і тэхнікі, літаратуры і мастацтва ў форме, даступнай чытачу-неспецыялісту. Гэтыя выданні шырока прадстаўлены ў фондах бібліятэк. Яны прызначаныя вельмі шырокаму колу чытачоў, пачынаючы з тых, хто мае падрыхтоўку ў аб'ѐме агульнаадукацыйнай школы і канчаючы навукоўцамі, якія працуюць у сумежных галінах. Навукова-папулярныя выданні выходзяць вялікімі тыражамі, разнастайныя па змесце і прызначэнні. Найбольш распаўсюджанымі ў бібліятэках з'яўляюцца выданні, прысвечаныя дасягненням, асновах і гісторыі навук; навукова-тэхнічнай і мастацкай творчасці; біяграфічныя выдання. Асаблівую групу выданняў складаюць успаміны (мемуары) і дзѐннікі.

Вучэбныя выданні ўтрымліваюць звесткі з якой-небудзь галіны навукі і тэхнікі. Да вучэбных выданням адносяцца навучальныя праграмы, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, хрэстаматыі, наглядныя дапаможнікі.Вучэбная праграма з'яўляецца асновай вывучэння любога прадмета, яна вызначае аб'ѐм, парадак вывучэння і выкладання адпаведнай дысцыпліны. Падручнік ствараецца на аснове праграмы ў строгай адпаведнасці з ѐй. Навучальныя дапаможнікі, у адрозненне ад падручнікаў, утрымліваюць звесткі па асобных раздзелах і тэмах праграмы. Яны могуць часткова замяніць падручнікі, а ў некаторых выпадках дапаўняюць іх. Вучэбна-метадычныя дапаможнікі выдаюцца ў асноўным для студэнтаў, якія навучаюцца на завочных і вячэрніх аддзяленнях УВА. Яны ўтрымліваюць парады, рэкамендацыі, указанні па вывучэнні тэм і пытанняў па асобных прадметах. Хрэстаматыі ўяўляюць сабой зборнікі тэкстаў і ўрыўкаў твораў, веданне якіх неабходна пры вывучэнні той ці іншай дысцыпліны. Наглядныя дапаможнікі маюць разнастайную форму (плакаты, табліцы, чарцяжы, схемы, фатаграфіі і інш.) і маюць на мэце палегчыць засваенне адпаведнай тэмы праграмы.

Прафесійна-вытворчыя выданні аказваюць непасрэдную дапамогу ў вытворчай і практычнай дзейнасці людзей. У адрозненне ад навуковых выданняў яны маюць розны чытацкі адрас. Выданні для спецыялістаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вышэйшага і сярэдняга звяна (аграномаў, інжынераў, тэхнікаў і інш.) называюцца навукова-вытворчымі. Масава-вытворчыя выданні выпускаюцца для працоўных розных прафесій і спецыяльнасцяў, якія з'яўляюцца вядучымі ў той ці іншай галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі.

Даведачныя выданні ўтрымліваюць звесткі (даведкі) па розных галінах навукі, тэхнікі, культуры, якія размяшчаюцца ў тым парадку, які дазваляе іх хутка знайсці. Найважнейшымі разнавіднасцямі даведачных выданняў з'яўляюцца энцыклапедыі і энцыклапедычны я слоўнікі, слоўнікі, даведнікі, календары. Энцыклапедыямі называюць даведачныя выданні, якія ўтрымліваюць найбольш істотную інфармацыю (падрабязную або кароткую) па ўсіх або асобных галінах ведаў і практычнай дзейнасці. ( «Энцыклапедыя» – грэцкае слова, якое азначае «сістэматызаваны збор ведаў».) Па зместу яны могуць быць універсальнымі і галіновымі, па структуры – алфавітнымі, сістэматычнымі, тэматычнымі. Энцыклапедыі розныя па аб'ёме: ад аднаго да некалькіх дзясяткаў тамоў. Галіновыя энцыклапедыі адрозніваюцца ад універсальных не толькі зместам, але і больш дакладным чытацкім адрасам. У большасці сваёй яны разлічаны на спецыялістаў і навуковых работнікаў той ці іншай галіны ведаў.

Універсальныя энцыклапедыі – не проста зборнікі артыкулаў і даведак, а стройная, глыбока прадуманая сістэма. Артыкулы ў энцыклапедыях маюць розны аб'ём і характар. Найбольш шырокімі з'яўляюцца артыкулы-агляды, якія ахопліваюць вялікія, складаныя тэмы. Ёсць артыкулы-даведкі, якія змяшчаюць пэўную інфармацыю, пра які-небудзь прадмет: яго гісторыі, тэорыі і сучасным стане. У кароткіх артыкулах-тлумачэннях даецца толькі азначэнне слова, часам тлумачыцца яго паходжанне. Кожны артыкул пачынаецца з вызначэння таго тэрміна (паняцця), які складае назву.

Слоўнікі ўтрымліваюць пералікі слоў ці словазлучэнняў, тэрмінаў, імёнаў з адпаведнымі характарыстыкамі. Шырокае распаўсюджванне атрымалі тлумачальныя, тэрміналагічныя, лінгвістычныя, біяграфічныя слоўнікі.Тлумачальныя слоўнікі тлумачаць сэнс слоў і словазлучэнняў. Іх мэта – дапамагчы ў разуменні зместу і ў правільным ужыванні слоў у вуснай і пісьмовай мовах.Тэрміналагічныя слоўнікі служаць для тлумачэння тэрмінаў і паняццяў.Біяграфічныя слоўнікі ўключаюць звесткі пра жыццё, працах грамадскіх і палітычных дзеячаў, навукоўцаў, вынаходнікаў, прадстаўнікоў мастацтва.Матэрыялы ў слоўніках размяшчаюцца ў алфавітным парадку.Даведнікі ўтрымліваюць вялікі фактычны матэрыял і шырокія лічбавыя дадзеныя.

Часопісы выходзяць па ўсіх галінах ведаў. У адрозненне ад газет часопісы падзяляюцца на навуковыя, прафесійна-вытворчыя, навукова-папулярныя, літаратурна-мастацкія.Навуковыя часопісы з'яўляюцца крыніцамі найноўшай інфармацыі аб ходзе, метадах і выніках навуковых даследаванняў у розных галінах навукі і тэхнікі. Як правіла, такія часопісы паступаюць у навуковыя бібліятэкі.Навукова-папулярныя часопісы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адыгрываюць важную ролю ў прапагандзе навуковых ведаў сярод шырокага кола чытачоў з рознымі інтарэсамі і падрыхтоўкай («Навука і жыццѐ», «Вакол свету»).

**Тэма 6. Арганізацыя вучэбнай, навукова-даследчай, самастойнай працы студэнтаў**

*6.1 Неабходнасць адаптацыі студэнта-першакурсніка да новага ладу жыцця*

*6.2 Арганізацыя самастойнай працы студэнтаў*

***6.1 Неабходнасць адаптацыі студэнта-першакурсніка да новага ладу жыцця***

Пачатак студэнцкага жыцця – сур'ѐзнае выпрабаванне для большасці студэнтаў, – неабходна прыняць новую сацыяльную ролю студэнта, прывыкнуць да новага калектыву, да новых патрабаванняў, паўсядзѐнных абавязкаў, далучыцца да прафесіі. Розная абстаноўка па-рознаму ўплывае на паводзіны і псіхалагічны стан першакурснікаў: адна справа пачуцці ў таварыстве сяброў, іншая – у незнаѐмым калектыве, трэцяе – на вачах у выкладчыкаў.  У працэсе адаптацыі адбываюцца змены ва ўнутраным свеце асобы, у выпрацоўцы новых спосабаў паводзін, якія дазваляюць спраўляцца з цяжкасцямі і авалодваць вучэбнай і грамадскай дзейнасцю. Пераход ад школьнай сістэмы навучання да ўсебаковай падрыхтоўцы будучага спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці з'яўляецца скокам, звязаным з павышэннем інтэнсіўнасці вучэбнай нагрузкі, патрабаванняў да каметэнцый. Каб аблегчыць гэты пераход сацыяльна-педагагічная і псіхалагічная службы БДУКМ праводзяць адаптацыйныя заняткі для першакурснікаў. Трэнінгі, псіхалагічныя гульні спрыяюць сціранню бар'ера паміж студэнтамі, знікненнюўсіх страхаў і перажыванняў з нагоды адаптацыі ў групе, пазітыўнага настрою. Неабходна пазнаеміцца з правіламі паводзінаў у ВНУ і пражывання ў інтэрнаце, звярнуць увагу на здаровы лад жыцця.

***6.2 Арганізацыя самастойнай працы студэнтаў***

Ухіл тэхналогіі навучання ў бок кіруемай самастойнай працы студэнтаў з’яўляецца не толькі ўмовай павышэння ўзроўню актыўнасці студэнтаў, а і выкладчыка, паколькі дзейнасць апошняга ў працэсе навучання пераарыентавана ад інфармацыйнай да арганізацыйнай — па кіраўніцтву самастойнай вучэбна-пазнавальнай, навукова-даследчай і прафесійнапрактычнай дзейнасцю студэнтаў.ы. Істотнай асаблівасцю самастойнай работы з’яўляецца актыўная разумовая дзейнасць студэнтаў, іх імкненне выявіць свой разумовы ўзровень і стан духоўных здабыткаў у выкананні пэўных заданняў. Такім чынам студэнт становяцца суб’ектам пазнавальнай дзейнасці. Змест і формы самастойнай работы студэнтаў па кожнай дысцыпліне распрацоўваюцца супрацоўнікамі кафедры ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі адукацыйнага стандарту. Матэрыял,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэкамендаваны для самастойнага вывучэння, студэнты павінны атрымліваць ад выкладчыкаўна першых тыднях семестра, па зместу матэрыялу для самастойнай працы можа ўключаць тэарэтычныя ці практычныя заданні па пэўных тэмах, комплексы індывідуальных дамашніх кантрольных работ па тэмах і раздзелах дысцыпліны. Усе віды заданняў падзяляюцца: 1) калектыўнаясамастойная работа; 2) самастойная работа рэпрадуктыўнага характару; 3) самастойная работа творчага характару.

Кіруемая самастойная праца студэнтаў — гэта працяг вучэбнага працэсу, яго неад'емная частка. Таму яна, як і іншыя формы (лекцыі, практычныя заняткі, вучэбная практыка), адпаведным чынам плануецца, арганізоўваецца, накіроўваецца і кантралюецца.

Асноўнымі формамі далучэння студэнтаў да навукова-даследчай дзейнасці з'яўляюцца:

- удзел у выкананні навукова-даследчых праграм, што фінансуюцца з розных крыніц;
- праца ў студэнцкіх навукова-даследчых аб'яднаннях: навуковых гуртках (СНК), навукова-даследчых групах (СНДГ), навукова-даследчых лабараторыях (СНДЛ);
- удзел у працы навуковых канферэнцый, у конкурсах, выставах,
- навуковыя даследаванні пры выкананні лабараторных, курсавых і дыпломных работ, а таксама магістарскіх дысертацый;
- выкананне індывідуальных даследчых заданняў у рамках аўдыторных заняткаў і падчас вучэбных і вытворчых практык.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1. Тэматыка і методыка выканання практычных работ

### Тэма 1. Уводзіны. Мэта, задачы курса. Прафесія “спецыяліст па сацыяльна-культурнай дзейнасці, выкладчык”

*Пытанні для абмеркавання:*

1. Якім чынам сацыякультурная сітуацыя ўплывае на характар і змест сацыяльна-культурнай дзейнасці.

2. Ці згодныя вы са сцвярджэннем, што феномены педагагічная дзейнасць і сацыяльна-культурная дзейнасць «старэйшыя» за гэтыя паняцці?

3. Дакажыце, што чалавечае жыццѐ немагчыма без феноменаў адпачынак, вольны час.

4. Якае месца займае сацыяльна-культурная дзейнасць у выхаванні і сістэме бесперапыннай адукацыі?

5. Чаму педагагічная дзейнасць ѐсць адна з істотных асноў чалавечага быцця? У чым яе ўніверсальны характар?

6. Чым адрозніваецца прафесійная дзейнасць спецыяліста па сацыяльна-культурнай дзейнасці ад непрафесійнай?

Пасля экскурсіі па аўдыторыях і кафедрах, у бібліятэку і чытальную залу падрыхтуйцеся да гульні ―Хто, дзе, што ѐсць ва ўніверсітэце?”:

*Куды бегчы студэнту ў інтэрнаце і каго пытацца, калі з раніцы тэмпература і дрэнна сябе адчуваеш?

інтэрнат № ___, пакой ____, Імя, Імя па бацьку ________________________

*Нумар тэлефона-факса _________________, забіраць у каб .________?

* У якіх выпадках студэнт можа напісаць у прафкам на матэрыяльную дапамогу (пералічыць) ______________________________________?

* Памер стыпендыі студэнта першакурсніка складае _______________ ?.

* Колькі каля БДУКМ дазволеных (спецыяльна абсталяваных) месцаў для смалення (курэння) і дзе яны знаходзяцца _____________________________?

* Якія дысцыплінарныя спагнанні за смаленне (курэнне) у неўстаноўленых месцах ___________?

* Аддзел кадраў для студэнтаў размешчаны ў кабінеце № __, у адным крыле будынка з (чым?___________________) на __ паверсе.

*Калі згублены нумарок з гардэроба, каб забраць верхнюю вопратку, трэба звяртацца да __________________________, у каб. __________?

*Гэтыя два бухгалтара працуюць са студэнтамі ў 228 каб., але адна з бюджэтнікамі, а другая з платнікамі, хто з кім?__________________ ___________________________ тэлефоны бухгалтэрыі ____________

* Чытальная зала бібліятэкі БДУКМ працуе штодня з 8.00 да 20.00 або па графіку пн-пт ____________, суб ___________, нядз ______?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

* Нават ноччу можна адправіць факс, або правесці плацёж праз банк, якія знаходзяцца __________________?

* Нават калі прад'явіць дакумент (_________________) у электроннай бібліятэцы або інфармацыйным цэнтры студэнт не зможа працаваць без ___________?

* Напішыце хто з наменнікаў дэкана і спецыялістаў нашага факультэта адказвае за адпаведную працу:

________________ _______________ __________________________

выхаваўчая праца, вучэбная праца навуковая дзейнасць

* У нашага дэкана ______________ каб. № ___, а тэлефон _________?

* Лагістыкай аўдыторнай працы выкладчыкаў і студэнтаў займаецца ў нашым дэканаце дыспетчар__________________?

